# Ды што гэта за паўстала...

Ды што гэта за паўстала,
Што на сьвеце праўды мала?
Топчуць праўду пад нагамі,
А няпраўда між панамі.
Стаіць праўда ды ў парозе,
А няпраўда за столікам.
Есьць праўда суху рыбу,
А няпраўда ашатрыну.
П’е праўда горка піва,
А няпраўда мёд і віно.

Гэтаю песьню запісаў я ў 1910 г. ў в. Вojштавічы Валожынскага пав. (даўней Ашмянскага), Вішнеўскае вол. ад Целяжэвічанкі, ведамае пяюхі ў гэнаj вёсцы. Запісаўшы, аддаў яе ў тым-жа годзе разам із jіншымі запісанымі (звыш сотні) песьнямі ў рэдакцыю “Нашае нівы”, дзе ўсі яны загінулі. Цяпер я запісаў яе другі раз із памяці. Паводле зьместу відаць, што гэта песьня штучная, але лучыла ў народную гушчу, падабалася ёj і сталася песьняj народнаj. Народ-жа дадаў да яе мэлёдыю. На жаль, мэлёдыя дагэтуль не запісана. Друкую гэтаю песьню як дзеля яе цікаўнага зьместу, так і дзеля таго, каб зьвярнуць увагу нашых зьбіральнікаў, што ёсьць яшчэ на сяле ладне вершаў беларускіх няведамых паэтаў, каторыя сталіся народнымі творамі. Усі яны павінны быць запісаны.